Poczta opłacona ryczałtem.

АДЗІН № КАШТУЕ 35 ГР.

№ 3. | 4 | СЕРАДА 18 ЛЮТАГА 1925 Г. Год II.

АВАДЗЕНЬ

ДВАТЫДНЁВІК САТЫРЫ, ЖАРТАЎ І СЬМЕХУ.



—Што гэта. Скржынскі... скрынкі...
—Зусім слушна: як цяпер міністр Скржыньскі, дык у Гданску вісяць скрынкі, а як будзе Недзялкоўскі Ежы, дык прылуча да Мацежы.



ВУЧАНЬ. -На што дзядзьку гэтулькі гарэлкі!
СЯЛЯНІН. -Маю гасьцей,дык трэба-ж пацешыць іх...
ВУЧАНЬ. -Вы ім толькі здароўе адыміце гэтым;цешыць і сьмяшыць можна толькі „АВАДНЁМ".
СЯЛЯНІН. -Гэта дзіва! Дзяды нашы і прадзяды ня чулі ніякага „АВАДНЯ" ніколі...Апрыч гарэлкі нічога іншага...
ВУЧАНЬ. -„Авадзень" нідаўна пачаў выходзіць у Вільні...
СЯЛЯНІН. -А...Ага...Дзякуй за добрую раду...калі так,дык сягоньня-ж я г о выпішу.

:::::

-Добры дзень,кума!
-На рынку была!
-Што ты глухая,кума?
-Не,замест рыбы,купіла парася!
-Бывай здарова,кума!
-Пяць злотых заплаціла!
-Мне зусім не цікава,колькі заплаціла.
-Не,кумок,я не уцякала,а заплаціла ды панясла...

Бізунчык.

С Т А Р А Ў С Я.

Прышоў сынок на сьвята з школы
Здароў як нада быць,вяселы;
А роднай матцэ усе здаецца
Што сыну цяжэнька жывецца.
-Ну,як,Антонька мой,ты жыў?
Мазгі зусім недзе забіў!
-Ат,мама,лепей бы маўчала
Чым глупства гэткае казала:
Мазгі забіў.Усё гукае...
Каленькам,-вось каму хапае!

П....а.

...Дзе прызнаюць мае кваліфікацыі,ці тут у Вільні,ці там у Кракаві,ды што з гэтага усяго будзе?

Я.Мал.

ЯЯЯЯЯЯЯЯЯЯЯЯЯЯЯЯЯЯЯЯЯЯЯЯЯЯЯЯЯЯЯЯЯЯЯЯЯ

У ВОЛАСЬЦІ.

-Э-гэ!У цябе у паспарце аж чатыры гады дабаўлена!

-Нічога дзіўнага...Мяне вайна гэтак састарыла,што нат, я на болей пастарэў!

Б-о.

ПАМІЖ ПІЛІГРЫМАЎ.

СТАРЫ.-У Кіева-Пячэрскай Лаўры манахі,каб спасьціся,замуроўвалі сябе жыўём на цэлыя гады.

МАЛАДЫ.-Гм...Зусім не пахвальна...А як-жа яны спраўлялі свае натуральныя патрэбы?

Б-о.

Нашы дзеці...

Рана ўстаўшы: -Дзядуля!чаму,дзядуля,не паміраеш?

ДЗЯДУЛЯ.-Вам нашто мая сьмерць?

Дзеткі.-А бо дзядуля казаў,што як пamрэш,дык нам люлька астанецца.

Акыш.

ХТО ЁН.

Ішоў адзін мніх праз лагі. Убачыў яго пастушок ды наўцёкі. Той дай звацъ яго лагодна,каб не палохаўся.Пастушок вярнуўся і здалеку спытаў :

-Хто ты?

Мніх адказаў:-Ня бойся!Хадзі бліжэй:я з Закону.

-А што гэта закон?-пытаў недаверчыва пастушок.

-Гэта такая сьвятая сямейка,-тлумачыў хлапцу мніх.

-А,цяпер я ведаю,хто ты!--ускрыкнуў хлапец:-Пэўна ты Пан Ёзус!

-Не,-ухмыльнуўся законьнік...

-То пэўна Матка Боска?-спытаў той.

-Дзе-ж там,не!

-То пэўна сьвяты Ёзэф?-дагадваўся малы шалуцька.

-І то не!-запярэчыў мніх.

-Ну то ўжо ведаю!-з радасьцю закрычаў пастушок:

-Пэўна ты вол,або асёл!

Акыш.

Што лепей...

- ЯНКА, на што ты лепш згадзіўся-б;ці жанатым сто гадоў жыць,ці нежанатым 50?

-А чаму гэта так пытаесься?

-Ну скажы!..

-Па майму лепей жыць кавалерам толькі 50 гадоў,чым жанатым сто у грызьні ды неспакоі...

Новы.

НЯ СЬЦЯМІЎ.

Падчас прошлай вайны,калі польскае войска адхадзіло з пад Дзісны,забег у вёсцы да селяніна польскі жаўнер ды пытае:


-Гдзе вуз паньскі?

-А во-во,паночку!-узяўся той за свой вус паказуючы...

-Не о то ходзі...Гдзе вуз для язды?

-А ужо тры дні, як узялі з канём пад хурманку!

П....ка.




Солтыс выйшоў з гміны з новымі падаткамі...

НІ ЗРАЗУМЕЛА.

Такі праўда,што з старымі
Усяго бывае:
Прыйшла з цэркві раз бабуля
Плача,як малая.
Што?чаго вы?Хто вас скрыўдзіў?
Сталі усе пытацца,
Але,бедная,ад жалю
ня можа стрымацца.
Ды ні жартам,а запраўды:
Аж сыплюцца сьлезы,
Як-бы шышачкі вясною
З вярбы,ці з бярозы.
Так расплакалась,ня можа
Аніяк стрымацца
Штаб толькі успакоіць
Сталі ўсе старацца.
Навакола,як-бы дзіва,
Яе абступілі
Гэты тое,той-другое
Усе гаварылі.
Розны дзівы і здарэньні
Сталі талкаваці
Абы толькі,каб як кольвек
Гутарку пачаці.
Вось,нарэшце,ледзь-ня-ледзь
І прагаварыла:
-Ой,паверце,мае дзеткі,
мне нішто ня міла!
-Ну чаму ды што такое,-
Хоць слоўца-б сказала
Але неяк,гэтым разам,
Гутарку пачалі:
Перш сьлязу з носу,як бобу,
Хвартухом згарнула,
Галаву чуць прыпадняўшы
Цяжка уздыхнула.
Пачала казаць,нарэшце.
А усе сталі слухаць
Так уважна,што пальцамі
Ні пасьмелі рухаць.
-Вы ня чулі тут,напэўна,
Сядзелі у хаце,
Што сягоньня поп у цэркві
Пачаў нам казаці:
-Будзе,-кажа-на тым сьвеці
Надта кепска з намі:
Плач і енк ды ўсе такое
І скрыгот зубамі.
-Ну дык што,чаго тут плакаць?
Сталі усе пытаці.
-Але,чаго!чым жаж я там
Буду скрыгатаці.
Маладым вам то нічога:
Зубоў поўна губа,
А чым я там буду скрыгаць--
Ніводнага зуба.
....

С.Крапіва.



РАЗСЫЛЬНЫ П.ІНСПЕКТАРА:--Чалавеча,што нясеш у мяшку?

Беларус:--Прыгаворы і дэкляраціі,што напісалі сяляне,каб адкрыць беларускую школу у вёсцы.

Разсыльны:--Я так сама нясу прыгаворы,але да крамы на паперу,..П.Інспектар казаў прадаць,бо у канцэлярыі німа ужо мейсца.

Я.Маланка.

МІХАЛКА.

-Міхалка,адчыні!,-крычаў хурман князя Х.,стукаючы у вакно пастуха-знахара.

-А што?-пачуўся голас.

-Зьбірайся да пана у палац!

Міхалка меў г.40...Цікавіўся ён адмалку зёлкамі і на ваколіцу дічыўся знахарам.

Паціху злез з печы,адчыніў дзьверы ..

-Добры вечар,Міхалка!Збірайся-пан просіць!

Вечар добры!-Проша сесьці...А на што там я патрэбны?

-Паненка хварэе,уся скура у пузырах...Ціж ня чуў,Міхалка, аб гэтым?

-Не памагла загравіца і дахтары...,казаў Міхалка апранаючыся,-а па мойму,нічога страшнога німа.

-Вось пан даведаўся аб табе і просіць.

-Ну,дык пойдзем,паночку.

-А зачым кацялок бярэш?

-Трэба...

Яны выйшлі.Дажджок накрапаваў-

Была пара летняя...Селі да, адумысна прысланай,панскай каламашкі ды паехалі.

....

У пакоях спаткаў Міхалку сам князь Х.,які адвёў яго да хворае дзяўчыны.Тая ляжала нерухома на ложку і стагнала.

Міхалка загадаў устаць ей ды паказаць цела.Стыдлiва,пры дапамозе самога бацькі-князя,паказалася...Уся скура на ейным целе была у пузырох.

-Гэта нічога,-казаў Міхалка,-дзяўчына паправіцца.

Ззаду за ім пачуўся сьмех: бонна-Францужка,паненка гадоў 30 хахатала з Міхалкавае мужыкаватасьці-гэтаж князеўну назваў дзяўчынай!

Міхалка папрасіў усіх выйсьці,сам адвярцеў кацялок з трапкі,наліў вады і паставіў гатавацца на сьпіртоўцы...Паненка страхавіта на яго пазірала. Як загатавалася вада ён,шапчучы малітвы,падсыпаў зёлак.

...Сьвежа-згатаваным лякарствам Міхалка нацёр усё балючае -

цела князеўны,пасьля, у суседнім пакоі,лег адпачыць.

....

Праз тыдзень князеўна магла хадзіць ужо да сталовай і разам з усімі спажываць страву.

За сталом пры ей садзілі Міхалку,як цэннага і надта паважанага знахара,з другога боку князеўны сядзела Прайцузка-бонна,што вучыла паненку абычайнасьці ды гаворкі французкай,далей -сядзелі князь з жонкай.

Міхалка,маючы добры апэтыт да яды,ня глядзеў ні на кога,сам браў мяса з талеркі рукамі ды ахвотна абгрызаў косьці...

Цярпеў князь,бо цаніў Міхалку дзеля дачкі.Проста у вочы сьмяялася з Міхалкі Пранцузка.

Ён затаіў зло да яе, а на вастроты ейныя не адказаў...

....

Кожным вечарам рабіў нацераньне Міхалка.Праз два тыдні ен казаў князю,што дачка таго можа выйсьці пагуляць на сьвежае паветра. Дзень гэты быў днём радасьці усей сямьікнязя і вось, неўзабаве,наўперадзі,па дарожцы у садзе ,ішоў мерным крокам сам князь з жонкай ,-за ім дачка з Міхалкам з аднаго боку і Пранцузкай-з другога.Ззаду ішоу лакей з кашолкай поўнай усякіх прысмакаў,цукеркаў ды ядоміны.

Пагода была найлепшая.Сонца сьвяціла мерна...Ветрык памагаў гуляючым,дуючы ім ззаду ды шмыгау па траве і дрэвах,шастаючы лісьцямі ды клонючы кветкі да зямлі.

Праходзючы ля аднэй заграпічнай расьліны Пранцузка,каб дапячы Міхалку,запыталася у яго:

-Як завецца гэта кветка,вы ня ведаеце?

Міхалку ужо даўно апрыкрылася яна сваей фальшывасьцю--шукаў спосабу адплаты.

-Ня ведаю,ды яна,наагул,не карысная чалавэку.

-Німа вам што казаць: ня ведаеце вы нічога.Вызю ніякае батанікі ня учылі...

-Гм...А вы,паненка,вучылі, а ці ведаеце які смак гэтае лісьцінкі?,-запытаўся Міхалка,зрываючы лісток нейкі,паміж травы,ды падносючы яе Пранцузцы. Тая насьмешліва гледзючы,узяла на зубы лісьцінку ды пачала смакаваць.

-Штож тут такога,-казала, нічога, толькі салодка...

-Паглядзім як табе будзе салодка!,-прабурчэў Міхалка.

Колькі мінут прайшло.Усе гуляючые ішлі далей удоўж саду.

Раптам...Пранцузка пачала чырванець,надувацца ды адставаць: лісьцінка Міхалкава рабіла сваё.

-Проша не адставаць,паненачка,-прагаманіла князёўна на Пранцузку гледзючы.

-Не,я не...не магу...,-і адстала. Ішоўшый ззаду лакей думаў,што яна хоча перакусіць,зблізыўся ды перад ей адчыніў кашолку,-куды там!Замахала рукамі.

Усе прыстанавіліся,абярнуліся ды дзівуюцца,а Пранцузка не мае сіл ісьці...стала...Уся чырвоная ,што раз-больш надуваецца, ня тут казана,як карова,калі абесца ВЕХУ...Князь успалохаўся:

-Міхалка,ратуй...яе...

-Нічога,панок,чорт яе ня схопіць.З мяне усіх гэтых два тыдні падтрунівала ,дык цяпер мы з яе адразу...

Пранцузка страхавіта вачмі пуляла...ды паўнела...Раптам... ...атрымалася нешта,падобнае грымоту...Пранцузка стала, твар засланіўшы рукамі,чырвоная па вушы...

Стыдліва адвярнуўся князь з жонкай і дачка яго з Міхалкам за імі ззаду-лакей.

Разбіраў усіх сьмех...і.. стыд...Я

Як дайшлі да палацу Міхалка стаў развітвацца:

-Ну,панок,Я ужо вашеці не патрэбны,..Дзяўчына , дзякуй Богу,мае цела чыстае...Найду дамоў.

-Ах,дзякуй,-вось табе за гэта фальварак. -і князь,цалуючы Міхалку у лоб ,сунуў таму ў рукі вялікую з гэрбамі паперу.

-Ну і дображ ты,Міхалка, прыстыдзіў тую,мудрую,Пранцузку. казаў пацешаны князь,-яе ўжо німа...З рэчамі на станцыю адехала...

-Гэта ей навука,паночку!

Яшчэ ня зышоў Міхалка з ганку, як падбегла князёўна,ды,чуючы вялікую радасьць ад вернутага ей здароўя і маладосьці,---

пачала цалавацьяго у шчаку.

Дзіву даліся усе,хто быў пры гэтым.Рад быў князь,яго сям'я і ўсе,хто пры іх быў ..

Француэка,тым часам,чакаючы цягніка на станцыі,праклінала сябе за язык , а Міхалку-за чары.

А.В.

::::::::::::::::::::::::::::::::::::

ДА КАГО ПАДОБНЫ.

Перад люстрам пан часаўся,
Пудрай абсыпаўся...
-Да каго я вось падобны?
Лакея спытаўся.
-Панок,каб хоць не салгаці,-
Той адпаведае,
-Здаецца,асоба Ваша
На льва выглядае!
-Да якога льва раўнуеш
Ты мяне,Іване?
-Да таго,што ў Ерусалім
- Нёс Езуса,-пане!
-Дурак з цябе!то ня леў быў
А асёл,Іване!
-А так,праўда,то асёл быў,
Дык даруйце,пане...

З украінск.А.В.

ПРЫ ПЕРАВОЗЕ.

На пораме,каля Міхалішак, было такое здарэньне:бедны чалавек просіць перавозьніка,каб перавёз яго дарма,бо ён ня мае чым заплаціць,усё аддаў на „падачкі", але за пераваз дасьць добрыя чатыры рады дабрадзею...

-А куды едзеш?-пытае перавозьнік чалавека.

-Вакол сьвету,браток,бо цяпер пашла такая мода.

-Ну,дык едзем.-кажа Пасувень |так зваўся той перавозьнік|

На другім берагу падарожнік „кругом сьвету"даў такія пекныя рады:

І.-Як зловіш блыху,браток,то пільнуйся,бо уцячэ.

2.-Як выходзіш на двор'не ставіся проці ветру:помні,што беднаму заўсёды вецер у вочы.

3.-А як што каля цябе трэсьне азірніся,ці хто ня відзіць.

4.-Апроч мяне нікога дарма болей неперавазі,бо збанкрутуеш.

Акыш.

....

НА ВЕЧАРЫНЕ.

-Скажы,братка,чаму гэта уся падлога быццам пяском пасыпана,бо,у часе скокаў,пад нагамі аж трашчыць?

-Вось дзіўны!Паглядзі толькі,хто скача...Скачуць-жа нашы!..

Ш--а.

ПРАЦАВІТАЯ ДЗЯЎЧЫНА.

Ой сонейка жалю ня мае,
Праз вакно мне усё дакучае:
Кладзе на мой тварык румяны
Загар ды людзям адкрывае,
Што хата мая ня прыбрана,
што сорам мне спаць,бо ня рана.
Ой шмат бы чаго даканала:
Ледз сьвет рупна-б я уставала,
Каб ў будні іграла мне дутка
І ў сьвята пад скрыпку скакала.
У шоўку я жала бы хутка.
Эх,добра жылося-б мне тутка.
Як ня бъюся-ўсё большае ліха.
Эх,спачну яшчэ з гора хоць крыху!
Калі стану я Богу прыгодна
Дык ня буду ніколі галодна.

Алёна.

АФІЦЭР І САЛДАТ.

Салдат,служучы у войску,нічога ні хацеў рабіць і заўсёды на пытаньні адказваў:ня ведаю.

Раз афіцэр пазваў яго да сябе ды пытае:

-Скажы мне,нікіпар,колькі будзе два ды два?

-Ня ведаю,Вашэсокородзіе!

-Сколькі будзе адзін ды адзін?

-Ня ведаю,Вашэсокородзіе!

-Ну,а калі,напрыклад,ты дурак адзін,а я другі ,колькі нас?

-ХаХа...Ужо ведаю:два дурака,Вашэсокородзіе!

Б-----к.



1. Барануючы брыдзе
Муж з карчмы да хаты.
Ў хаце жонка хджэць яго
Латаець там латы.
-Жонка,золатца мае,
Хоць адзін разочак
Пашкадуй,ня бі мяне-
Гнуся ў паясочак!
-Ой,за штож я маю біць
Калі любы мне ты.
Ляж,саколік,перасьпі
Хай хмель пройдзе гэты.

-Гэй ты жонка,ведзма-баба!
Пахмяліцца,есьці!
Толькі крута-водкі,яйцаў
Мне бардзей прынесьці!
-Га,праснуўся,дык і добра:
Лепш цяпер пачуеш
Цапялы смак,як прыўдару,
Дык аж затанцуеш!
Вось за хмель,за валацугства
Параўную косьці,
Ты ня дзяк,я ж папоўна
Цацкацца з любосьцяй.

Алёна.

ЗАГАДКІ.

1. Не лякарства,а здароўя дадае,-ня хлеб,а жыць без яго ня можна,- за ўсё-наймілейшы,а да сьмерці падобны.
2. "Чый гэта голас,што чуюць і глухія?
3. Ні стукаў,ні грукаў,-сам пад вакно падляцеў.
4. Ня відаць,а міла,..Не багацьце,а цешыць.
5. Прыйдзе бяз ног,возьме не палажыўшы і зарэжа бяз нажа.
6. Дзе ў пацемку можна бачыць усякія абразы?

б..а.

СЕКРЭТ.

- Будзьце пэўны,паненачка, што нікому не адгукнуся аб тольк-і-што перажытым шчасьці.

-Я думаю!Калі-б кожны хацеў аб гэтым гукаць,як-бы я тады паказалася на вуліцу...

Восіак.

Наша ПОЧТА.

Падпіску атрымалі: па 3 зл.- ад Янкі Станкевіча;па 3 зл.60 гр. ад хвер.Кобака,Я.Луцэвіча і Карабейніка;па 2 зл. ад Чэрвінскага Севашкі ,Ліпскага,Дзынгеля,Мацiаса,Севашкі;па 1 зл. 80 гр. ад Зімніцкага,Дапыроуны,П.Станкевіча,З.Краповіцкай,М.Станкевіча, А.Стэповіча,Андр.Цікоты,Санчука, Я.Якімовіча,Казюковіча,Мазурака, Лагуненка,Білева,Казла,Шнаркевіча,Буйвола,Трынды,Красоўскага, Янюка,Місюнаса,Дэшкоўскага,Пасюкевіча.Гэнэральчыка,Поболя;1з.90 ад Ключановіча;1зл. прыслаў Я.Пугач;1зл.50-Тарасэвіч;1зл.55гр.- А.Кот.

Усім тым,хто прыслаў грошы „Авадзень" пашлецца акуратна.

Адказы на запытаньні дамо у наступным нумары .

Заахвочвайце да падпіскі сяброў!

РАЗГАДКІ:1.Сон,2.Сумленьне,3. Дзень,4.Песьня або музыка,5.Сьмерць,6.У кінематографі.

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі-Wilno Завальна 7 пры кнігарні.

ПАДПІСКА:на 3 м.=1зл.80гр.,на паўгода=3зл.50гр ,на год=7зл. усяго.
За граніцу на год=тры даляры.

Рэдактар-Выдавец А.Васілеўскі.

Літ.Маца,вуліца Домброўскага 3,у ВІЛЬНІ.